15.Омельченко Е.Л., Андреева Ю.В. Что остается в семейной истории: память о советском сквозь разговор трех поколений // Социологические исследования. 2017. № 11. С. 147–156.
16. https://www.questia.com/read/123753478/generations-culture-and-society Дата доступа: 12.06.2019.
17. Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў XXI ст.: парадоксы развіцця // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы междунар. Науч. Конф., посвящ. 70-летию ист. Фак. БГУ, Минск 15-16 апр.2004 г. / Редкол.: В.Н. Сидорцов (отв.ред) и др. Мінск: БГУ, 2004. С.42–45.
18. Хальбвакс М. Х. Социальные рамки памяти / Пер. с фр. и вступ. статья С.Н. Зенкина. М.: Новое издательство, 2007.
19. Бегунова Е. А. К определению понятия культурной памяти в зарубежной гуманитаристике // Вестник Кемеровского государственного университета культуры и искусств. 2017. № 39. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/k-opredeleniyu-ponyatiya-kulturnoy-pamyati-v-zarubezhnoy-gumanitaristike (дата обращения: 01.07.2019).

УДК 338(476)(091)

## УКАРАНЕННЕ НАВУКОВЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ КАФЕДРЫ Ў НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС БДУ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ГІСТОРЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ»)

***А. В. Бурачонак***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, burachonak@bsu.by*

У артыкуле разглядаюцца магчымасці выкарыстання навуковых распрацовак кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу ў адукацыйным працэсе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Выяўлены здабыткі і патэнцыял выкладчыкаў кафедры па вывучэнні праблем развіцця прадпрымальніцтва на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Паказаны магчымасці выкарыстання інавацыйных методык і тэхналогій пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя прадпрымальніцтва ў Беларусі».

**Ключавыя словы:** *прадпрымальніцтва; Беларусь; міждысцыплінарнасць; эўрыстычны падыход.*

## ВНЕДРЕНИЕ НАУЧНЫХ ДОСТИЖЕНИЙ КАФЕДРЫ В УЧЕБНЫЙ ПРОЦЕСС БГУ (НА ПРИМЕРЕ ДИСЦИПЛИНЫ «ИСТОРИЯ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВА В БЕЛАРУСИ»)

***А. В. Бурачонок***
*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, burachonak@bsu.by*

В статье рассматриваются возможности использования научных разработок кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени в образовательном процессе Белорусского государственного университета. Выявлены достижения и потенциал преподавателей кафедры по изучению проблем развития предпринимательства на территории Беларуси в конце XVIII – начале XXI в. Показаны возможности использования инновационных методик и технологий при преподавании учебной дисциплины «История предпринимательства в Беларуси».

**Ключевые слова:** *предпринимательство; Беларусь; междисциплинарность; эвристический подход.*

## INTRODUCTION OF SCIENTIFIC ACHIEVEMENTS OF DEPARTMENT TO EDUCATIONAL PROCESS OF BSU (CASE OF DISCIPLINE «HISTORY OF ENTREPRENEURSHIP IN BELARUS»)

***A. V. Burachonak***
*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, burachonak@bsu.by*

The article presents possibilities of using research results of scientific developments of the Department of Modern and Contemporary History of Belarus in educational process of the Belarusian State University. Research achievements and potential of Department members in study of entrepreneurship development in Belarus at the end of XVIII – the beginning of XXI century were revealed. Possibilities of using innovative techniques and technologies in the teaching of discipline «History of Entrepreneurship in Belarus» are showcased.

**Key words:** *entrepreneurship; Belarus; interdisciplinarity; heuristic approach.*

2019 год у Беларускім дзяржаўным універсітэце быў багаты на юбілеі. 85 год з моманту пачатку існавання адзначылі гістарычны факультэт і факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі, 80 год – філалагічны факультэт, 75 год – факультэт журналістыкі, 30 год – эканамічны факультэт і факультэт філасофіі і сацыяльных навук і г.д. У гэтым шэрагу знамянальных дат варта вылучыць і 25-годдзе кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ, якая на сённяшні дзень з'яўляецца ўнікальным цэнтрам па ажыццяўленні сістэмнай навукова-педагагічнай і аналітычнай дзейнасці ў галіне гісторыі Беларусі XIX – пачатку XXI ст. Супрацоўнікамі кафедры ажыццяўляюцца навуковыя распрацоўкі па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, сацыяльнай, канфесійнай, эканамічнай, ваеннай гісторыі Беларусі новага і навейшага часу і па шэрагу іншых напрамкаў. Вынікі даследаванняў штогод знаходзяць адлюстраванне не толькі на старонках манаграфій і ў артыкулах прафесарска-выкладчыцкага складу, але і ў змесце вучэбных дысцыплін, якія чытаюцца студэнтам амаль усіх факультэтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У якасці адной з дысцыплін па выбару студэнтам гістарычнага факультэта і факультэта міжнародных адносін БДУ з 2013 г. прапаноўваецца «Гісторыя прадпрымальніцтва ў Беларусі». З году у год шэраг навучэнцаў становяцца яе слухачамі, што дазваляе ім асэнсаваць спецыфіку фарміравання і эвалюцыі беларускай бізнес-мадэлі з канца XVIII да пачатку XXI ст. Вывучэнне студэнтамі названай дысцыпліны забяспечвае фарміраванне ў іх ведаў аб асноўных этапах, падзеях і імёнах, звязаных з прадпрымальніцтвам у айчыннай гісторыі. Дадзеная вучэбная дысцыпліна знаходзіцца на сутыкненні некалькіх галін навуковых ведаў – гісторыі, эканомікі, права, сацыялогіі і інш. Пры гэтым у адрозненне ад «Эканамічнай гісторыі Беларусі», у межах дысцыпліны «Гісторыя прадпрымальніцтва ў Беларусі» перш за ўсё акцэнтуецца ўвага на ролі чалавечага фактару ў развіцці бізнесу на пэўным адрэзку часу. У сувязі з гэтым насычэнне зместу вучэбнай дысцыпліны вымагае звароту да вынікаў даследаванняў, якія ажыццяўляюцца ў межах навуковай школы «Сацыяльная гісторыя Беларусі XIX – пачатку XX ст.». Для асэнсавання студэнтамі спецыфікі фарміравання слоя прадпрымальнікаў і дзелавога асяроддзя, у якім яны ажыццяўлялі сваю дзейнасць, істотным з'яўляецца разуменне такіх пытанняў, як сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства ў парэформенны перыяд [1], міжсаслоўная мабільнасць [2], эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча ключавых саслоўных катэгорый насельніцтва Беларусі гэтага часу – шляхты [3], купецтва [4], мяшчанства [5], ганаровага грамадзянства [6, 7], сялянства [8] і інш.

Для фарміравання ў студэнтаў разумення працэсаў, звязаных з развіццём прадпрымальніцкай дзейнасці ў Беларусі на пэўным гістарычным этапе, істотнае значэнне, як ужо адзначалася, мае характарыстыка асяроддзя, у якім дзейнічалі прадстаўнікі дзелавых колаў беларускага грамадства. Пры раскрыцці зместу паняцця «дзелавое асяроддзе» варта данесці да навучэнцаў, што па сутнасці яно ўяўляе сабой сукупнасць сацыяльна-эканамічных, палітычных і рэгулятарных умоў вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці. Пры гэтым важна не толькі ўсебакова адлюстраваць уплыў сацыяльна-эканамічных фактараў на развіцці пэўнага гаспадарчага кірунку [9], але і засяродзіць увагу на працэсе фарміравання арганізацыйна-прававых асноў прадпрымальніцтва [10], эвалюцыі сістэмы падаткаабкладання [11, 12], трансфармацыі форм ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці прыватнымі асобамі [13] і інш. Пэўныя складаючыя дзелавога асяроддзя як прадмет навуковага даследавання, відавочна, знайшлі сваё адлюстраванне ў гістарыяграфіі, аднак на гэтым праца не павінна спыняцца.

Нягледзячы на міждысцыплінарны характар, у аснове зместу вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя прадпрымальніцтва ў Беларусі» знаходзяцца веды аб ключавых падзеях і імёнах беларускага бізнесу на розных гістарычных этапах. Гэтыя пытанні займаюць пачэснае месца ў праблематыцы навуковых распрацовак кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Храналагічна яны больш ахопліваюць дарэвалюцыйны перыяд [14–19] айчыннай гісторыі, але і навейшы час [20–21] таксама не застаецца па-за ўвагай. Вынікі даследаванняў супрацоўнікаў і аспірантаў кафедры ў сукупнасці са здабыткамі айчыннай гістарыяграфіі [22] дазваляюць комплексна прасачыць спецыфіку фарміравання і эвалюцыі беларускай мадэлі прадпрымальніцтва з канца XVIII да пачатку XXI ст., сфарміраваць неабходныя кампетэнцыі ў будучых выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Варта адзначыць, што на сучасным этапе актуальная задача адукацыйнага працэсу заключаецца не ў простым пераносе ведаў ад выкладчыка да студэнта, а ў стварэнні

адкрытага адукацыйнага асяроддзя, у межах якога навучэнцы маюць магчымасць атрымаць уласны адукацыйны прадукт. Для дасягнення гэтага прадугледжана выкананне студэнтамі адкрытых (эўрыстычных) заданняў, галоўнай прыкметай якіх з'яўляецца адсутнасць адназначнага і правільнага адказу, што дазваляе прадэманстраваць разнастайнасць рашэнняў большасці прафесійных задач і жыццёвых праблем [23, с. 63]. З мэтай прадастаўлення студэнту магчымасці адлюстраваць уласны погляд на асноўныя праблемы фарміравання дзелавога асяроддзя на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. пры засваенні вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя прадпрымальніцтва ў Беларусі» запланавана выкананне ўзаемазвязаных і ўзаемадапаўняльных адкрытых (эўрыстычных) заданняў. Спачатку навучэнцы атрымліваюць магчымасць паставіць сябе на месца менеджараў па развіцці бізнесу пачатку XX ст. і паспрабаваць з дапамогай алгарытму, які ўключае сем паслядоўных крокаў, мадэрнізаваць адно з тагачасных вытворчых прадпрыемстваў. Па выніках выканання задачы прадугледжана дэманстрацыя адукацыйных прадуктаў студэнтаў, іх абмеркаванне і параўнанне з рэальнымі прыкладамі дасягнення поспехаў у прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі на мяжы XIX–XX стст. Другое заданне прадугледжвае вылучэнне з усіх выказаных навучэнцамі прапаноў метатэхналогій – інструментаў для дасягнення поспеху ў прадпрымальніцкай дзейнасці, якія не згубілі актуальнасці да нашага часу. Выкананне прыведзеных эўрыстычных заданняў скіраваны на паглыбленне ведаў аб стане прамысловага прадпрымальніцтва ў Беларусі ў пачатку XX ст., развіццё навыкаў выкарыстання даных аб мадэлях і культуры паводзін прадпрымальнікаў у канкрэтна вызначаных гістарычных абставінах, больш глыбокае фарміраванне ў студэнтаў камунікатыўных кампетэнцый.

Падсумоўваючы, варта адзначыць, што навуковыя распрацоўкі кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу адрозніваюцца не толькі высокай ступенню актуальнасці, але практычнай значнасцю. І вучэбная дысцыпліна «Гісторыя прадпрымальніцтва ў Беларусі» ў гэтым плане не з'яўляецца выключэннем, паколькі ў умовах, калі Рэспубліка Беларусь актыўна ўцягнута ў працэс сусветнай эканамічнай інтэграцыі, вывучэнне і ўлік гістарычнага вопыту развіцця гаспадарчых сувязей павінна даць дзяржаве дадатковыя інструменты для рэалізацыі знешнеэканамічных задач і адстойвання нацыянальных інтарэсаў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Каханоўскі А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск : БДУ, 2013.
2. Каханоўскі А. Г. Міжсаслоўная сацыяльная мабільнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования. Минск, 2012. Вып. 7. С. 80–91.
3. Макарэвіч В. С. Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII – XIX ст.). Мінск : БДУ, 2018.
4. Каханоўскі А. Г. Сацыяльнае аблічча купецтва Беларусі на мяжы XIX–XX ст. // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. Гіст. Экан. Права. 2004. № 2. С. 9–12.
5. Каханоўскі А. Г. Эвалюцыя саслоўна-прававога становішча мяшчан Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Беларус. гіст. часоп. 2016. № 2. С. 5–13.
6. Каханоўскі А. Г. Ганаровыя грамадзяне ў саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2. Гіст. Экан. Права. 2016. № 1. С. 15–20.
7. Щерба Т. Н. Отношение почетных граждан к белорусскому национально-культурному движению в начале XX в. // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст. : зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 лістапада 2018 г. / рэдкал. : А. Д. Кароль (старш.) [і інш.]. Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2018. С. 284–286.
8. Маскевіч Г. І. Палітыка ўрада Расійскай імперыі ў 60–90-я гг. XIX ст. як фактар фарміравання сацыяльнай стратыфікацыі сялянства Беларусі // Працы гістарычнага факультэта БДУ. Мінск, 2006. Вып. 7. С. 97–107.
9. Бурачонак А. В. Сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця прамысловага прадпрымальніцтва ў Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.) // Працы гістарычнага факультэта БДУ. Мінск, 2014. Вып. 9. С. 3–14.
10. Бурачонак А. В. Фарміраванне арганізацыйна-прававых асноў прамысловага прадпрымальніцтва ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. // Беларус. археагр. штогоднік. Мінск, 2014. Вып. 15. С. 130–142.
11. Бурачонак А. В. Рэгламентацыя падаткаабкладання прамысловага прадпрымальніцтва ў Беларусі ў другой палове XIX ст. // Беларус. гіст. часоп. 2012. № 1. С. 35–39.

12. Бурачонак А. В. Эвалюцыя заканадаўства ў сферы падаткаабкладання гандлю на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. // Беларус. археагр. штогоднік. Мінск, 2016. Вып. 17. С. 118–133.
13. Бурачонак А. В. Распаўсюджванне асацыіраванага ка-піталу на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 2. С. 54–61.
14. Веремейчик А. Е. Экономическое положение Несвижского замка и Несвижской ординации в первой четверти XIX в. // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гіст. Экан. Права. 2007. № 3. С. 7–12.
15. Лебедзева І. В. Сацыяльна-эканамічнае становішча дзяцей Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: крыніцазнаўчы аспект // Науч. труды Респ. инст. высш. школы. 2019. Вып. 19. Ч. 1. С. 266–273.
16. Макарэвіч В. Гандаль соллю у беларускіх і літоўскіх паветах Літоўскай губерні ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. // Беларусь, Клецкі край і Эдвард Вайніловіч: матэр. навук.-практ. канф., Клецк, 21 верас. 2018 г. / рэд. кал.: А. А. Каваленя (навук.рэд.) [і інш.]. Мінск : ІВЦ «Мінфіна», 2019. С. 61–67.
17. Каханоўскі А. Г. Аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст. і трансфармацыйныя змены ў беларускай вёсцы // История и историография: объективная реальность и научная интерпретация : сб. науч. ст. по материалам междунар. науч. конф., посвящ. 140-летию со дня рождения акад. В. И. Пичеты / редкол.: А. Д. Король (гл. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2018. С. 233–238.
18. Бурачонак А. В. Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі (1861–1914 гг.) : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2013.
19. Кухаренко А. А. Деятельность Крестьянского поземельного банка на территории Беларуси в период столыпинской аграрной реформы (1906–1914 гг.) // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. Гіст. Экан. Права. 2013. № 2. С. 15–18.
20. Жилинский П. А. Возрождение предпринимательства и начало становления негосударственного сектора экономики в Беларуси (1987–1991) // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. Гіст. Экан. Права. 2016. № 1. С. 14–18.
21. Жылінскі П. А. Ад плана да рынку: пачатак трансфармацыі эканомікі Беларусі ў гады палітыкі перабудовы // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сер. гум. навук. 2016. № 4. С. 38–45.
22. Бурачонак А. В. Дзелавая актыўнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. як актуальная праблема айчыннай гістарыяграфіі // История и историография: объективная реальность и научная интерпретация: сб. науч. ст. по материалам междунар. науч. конф., посвящ. 140-летию со дня рождения акад. В. И. Пичеты / редкол. : А. Д. Король (гл. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2018. С. 184–188.
23. Король А. Д., Китурко И. Ф. Основы эвристического обучения : учеб. пособие. Минск: БГУ, 2018.

УДК 008(476)(091)

## «ГОРОД КОТОРОГО НЕТ»: ИССЛЕДОВАНИЕ ГОРОДСКОЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСИ В ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ЭТНОЛОГИИ[1]

***С.А. Захаркевич***

*Белорусский государственный университет, пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, stepanzah@mail.ru*

Статья посвящена анализу развития изучения городской культуры Беларуси в отечественной этнологии с XIX в. по настоящее время. Сделан широкий обзор историографии проблемы, а также попытка выяснения причин недостаточного внимания к исследованию всех аспектов культуры городов Беларуси.

***Ключевые слова:*** *городская культура Беларуси; городская этнология Беларуси; этнологические исследования городской культуры; историография городской культуры Беларуси.*

## «ГОРАД ЯКОГА НЯМА»: ДАСЛЕДАВАННЕ ГАРАДСКОЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ Ў АЙЧЫННАЙ ЭТНАЛОГІІ

***С.А. Захаркевіч***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, пр.Незалежнасці, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, stepanzah@mail.ru*

[1] Статья подготовлена в рамках выполнения проекта БРФФИ Г19АРМ-035 «Этнокультурные процессы в XX–XXI вв.: сравнительное исследование городов Армении и Беларуси».